# МЯДОВА-ЯБЛЫЧНЫЯ ЗАПЕЎКІ



**Па гарызанталі: 1.** ... жнівень яблыкамі пахне *(прык.)*. **5.** Ёсць ... ў садзе — будзе яблык на стале *(прык.)*; 14-га жніўня адзначалі Мядовы Спас (Мядовік), а 19-га жніўня — Яблычны Спас. **7.** «Тонка ... высока, // Нельга яблыка сарваць. // Мой мілёначак далёка, // Галасочка не чуваць». Прыпеўка. **10.** Герой старажытнагрэчаскага міфа, які імкнуўся даляцець да Сонца. **11.** «Ой, лапці мае, // Чатыры ... ! // Быў мядовы мой жаніх, // А мужык стаў горкі». Прыпеўка. **12.** ..., або Гаёвы дзед. Дух, які, паводле павер'яў, сочыць за парадкам у лесе. **15.** Птушка са стракатым апярэннем, якая, паводле беларускага міфа, была царом птушак. **16.** У чужую жонку ... мёд кладзе, а ў сваю воцат падлівае *(прык.)*. **19.** Чаравікі для гульні ў футбол. **20.** «У згодзе з пчоламі і трутні. // П'юць той мёд, як ...». З верша Я. Купалы «Пчолы і трутні». **23.** Інертны газ. **26.** Пчала — Божая ... *(прык.)*. **27.** «Між лісцяў скрозь ... чырвона-ружовы: // Даспелі сінап, і шафран, і ранет». З верша В. Гардзея «На яблычны Спас». **28.** «Мая мілачка фарсіла, // ... мёдам мазала. // Ды сама ка мне хадзіла, // Пад вароты лазіла». *(Прыпеўка)*.

**Па вертыкалі: 1.** З мёдам і каліна — ... *(прык.)*. **2.** Трос, які служыць сродкам перадачы цягавай сілы. **3.** Хто на Сілу жыта пасее, у таго на ... надзея *(прык.)*; прысвятак Сіла адзначалі 12-га жніўня. **4.** Чарада птушак; многія з іх у жніўні пакідаюць Беларусь. **5.** «О, белыя яблыкі, белыя яблыкі, // Пялёсткаў шалёны хвалюючы ...». З верша П. Панчанкі «Белыя яблыкі». **6.** «Бо чужая жонка, // Як ... , горка. // А я маладзенька, // Як мёд, саладзенька». Прыпеўка. **8.** «Калі хочаш доўга жыць і зберагчы ... , абавязкова еш мёд». Авіцэнна. **9.** Прыйшоў ... — жыта на зіму сей (прык.); прысвятак ... адзначалі 24-га жніўня. **13.** «Што ты, міленькі, фарсіш, // Я цалую, а ты спіш. // Твае губкі, як мядок, // Сам халодны, як ...». *Прыпеўка*. **14.** «... к бацьку ў госці едзе // Ды вязе гасцінчыкі : // Тры садовыя яблычкі». З беларускай народнай песні «Што за шум на дуброве». **17.** На другі Спас і ... яблычка з'есць *(прык.)*. **18.** «Ёсць мёд — будуць мухі, ёсць дзяўчаты — будуць і ... *(прык.)*. **21.** «Недзе камар ціха струны наладжвае, // ... падала свой пчала, пралятаючы». З верша М. Танка «Канцэрт у сене». **22.** Адзін закід невада. **24.** Адзін круг танца. **25.** Чарадзей.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ!**

**Па гарызанталі:** 1. Месяц. 5. Пчала. 7. Яблынька. 10. Ікар. 11. Аборкі. 12. Гаюн. 15. Удод. 16. Чорт. 19. Буцы. 20. Дзеткі. 23. Неон. 26. Угодніца. 27. Колер. 28. Губкі.

**Па вертыкалі:** 1. Маліна. 2. Цяж. 3. Хлеб. 4. Шнур. 5. Пах. 6. Асінка. 8. Маладосць. 9. Баўтрамей. 13. Лядок. 14. Дачка. 17. Жабрак. 18. Жаніхі. 21. Звон. 22. Тоня. 24. Тур. 25. Мар.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.44 | 20.43 | 14.59 |
| Віцебск — | 5.30 | 20.37 | 15.07 |
| Магілёў — | 5.34 | 20.33 | 14.59 |
| Гомель — | 5.36 | 20.25 | 14.49 |
| Гродна — | 6.00 | 20.58 | 14.58 |
| Брэст — | 6.06 | 20.53 | 14.47 |

### Месяц

***Маладзік 8 жніўня***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.*** *Васіля, Еўдакіма, Івана, Мікалая, Сяргея, Юрыя.*
***К.*** *Алены, Дзіяны, Іпаліта, Максіма, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

**13 ЖНІЎНЯ**






**1911** год — нарадзіўся Аляксей Іванавіч Радзіеўскі, удзельнік баёў на тэрыторыі Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, генерал арміі, Герой Савецкага Саюза, кандыдат ваенных навук, прафесар. У Вялікую Айчынную ваяваў на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, 2-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах. 2-я танкавая армія на чале з Радзіеўскім удзельнічала ў вызваленні Украіны, контрнаступленні войскаў Заходняга фронту, у Люблін-Брэсцкай, Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях.

**1941** год — нарадзіўся Міхаіл Міхайлавіч Грышчанка, беларускі артыст балета. У 1960—1981 гадах саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Танцоўшчык гераічнага плана.

**1951** год — Мінскі падшыпнікавы завод выпусціў першую прадукцыю.




**1871** год — нарадзіўся Карл Лібкнехт, дзеяч германскай сацыял-дэмакратыі, адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Камуністычнай партыі Германіі (КПГ) і 2-га Інтэрнацыянала.



**1901** год — нарадзіўся Барыс Пятровіч Чыркоў, расійскі акцёр тэатра і кіно, педагог, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. У 1950—1965 гадах у Маскоўскім тэатры імя А. С. Пушкіна, з 1966-га — у Маскоўскім тэатры імя М. В. Гогаля. Здымаўся ў фільмах: «Юнацтва Максіма», «Вяртанне Максіма», «Верныя сябры», «Жывыя і мёртвыя». Лаўрэат чатырох Сталінскіх прэмій і Дзяржаўнай прэміі РСФСР імя К. С. Станіслаўскага.

**1906** год — нарадзіўся Іван Уладзіміравіч Лукінскі, савецкі кінарэжысёр, народны артыст РСФСР. Паставіў фільмы: «Салдат Іван Броўкін», «Іван Броўкін на цаліне», «Панядзелак — дзень цяжкі», «Вясковы дэтэктыў» і іншыя.

**1926** год — нарадзіўся Фідэль Кастра Рус, кубінскі дзяржаўны і палітычны дзеяч. Лідар Кубінскай рэвалюцыі (1953—1959). Першы сакратар ЦК Кампартыі Кубы (1965—2006), старшыня Дзяржаўнага савета (1976—2006).

**1936** год — заснаваны Сусветны яўрэйскі кангрэс.

**1961** год — па рашэнні ўлад былой ГДР была закрыта граніца паміж Усходнім і Заходнім Берлінам. Пачалося ўзвядзенне берлінскай сцяны, якая на многія гады стала сімвалам падзелу Германіі на дзве дзяржавы (ліквідавана 9 лістапада 1989-га).

**1971** год — нарадзіўся Уладзімір Уладзіміравіч Удавічэнкаў, расійскі акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Прэзідэнт і яго ўнучка», «Тарас Бульба», тэлесерыялах «Брыгада», «Белая гвардыя», «Да пабачэння, хлопчыкі» і іншых.




**ЖУБЕР:**

*«Найлепшыя душэўныя памкненні не вартыя нічога, калі не вядуць да добрых учынкаў».*




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2172.

Нумар падпісаны ў 19.30 12 жніўня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12